**С. А. Паўлава,** *прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;*
**Н. Я. Петушка,** *дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ ЎМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ РЭФЛЕКСІЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з тэндэнцый развіцця асобы прафесіянала ў сучасных умовах становіцца паглыбленне ўвагі асобы да свайго ўнутранага свету, іншымі словамі, зацікаўленасці спецыяліста ў здзяйсненні рэфлексіі ўласнай прафесійнай дзейнасці, у сабе як прафесіянале і асобе.

Тэрміналагічны апарат кампетэнтнаснага падыходу ў працах І. Е. Елінай, І. А. Зімняй, А. В. Хутарскога ўжо падрыхтаваў аснову для сучаснага разумення кампетэнтнасці, а далей і вызначэння рэфлексіўнай кампетэнтнасці. У педагогіцы гэта паняцце ўведзена ў навуковы ўжытак В. А. Палішчук. Пад рэфлексіўнай кампетэнтнасцю яна разумее «прафесійную якасць асобы, якая дазваляе найбольш эфектыўна і адэкватна здзяйсняць рэфлексіўныя працэсы, рэалізацыю рэфлексіўнай здольнасці, што забяспечвае працэс развіцця і садзейнічае творчаму падыходу да прафесійнай дзейнасці, дасягненню яе максімальнай эфектыўнасці і выніковасці» [2].

Дадзенае вызначэнне адрозніваецца ўніверсальнасцю трактоўкі, што дазваляе выкарыстоўваць яго ў любой прафесійнай сферы і ў бібліятэчнай адукацыі.

Далей паняцце «рэфлексіўная кампетэнтнасць» удакладнялася і, па меркаванні Г. А. Паляковай і І. П. Стацэнка, з’яўляецца «інтэгратыўнай якасцю асобы, якая характарызуе ступень засваення сукупнасці рэфлексіўных кампетэнцый, неабходных для эфектыўнай прафесійнай дзейнасці» [3]. У дачыненні да нашага прадмета найбольш прадуктыўным і дакладным можна лічыць вызначэнне А. В. Піскуновай: «рэфлексія – аснова педагагічнага праектавання на ўсіх яго этапах: ад задумы мэты да атрымання і аналізу вынікаў». Таксама навуковец уводзіць катэгорыю «рэфлексіўна-праектная кампетэнтнасць» [1]. Рэфлексія з’яўляецца важным і неабходным кампанентам у струк-

туры інавацыйнай дзейнасці. Цікавая пазіцыя А. В. Хутарскога, які абгрунтаваў паняцце «адукацыйная рэфлексія» і разглядае яе як від дзейнасці [4]. Па сутнасці, педагагічная дзейнасць мае рэфлексіўны характар, які праяўляецца ў тым, што, арганізуючы дзейнасць студэнтаў, педагог імкнецца глядзець на сябе і свае дзеянні як бы вачыма падапечных, улічваць іх меркаванні, погляды, уяўляць іх унутраны свет, іх ацэнку сваёй дзейнасці; зразумець эмацыянальны стан, дзе знаходзяць адлюстраванне ўсе кампаненты структуры рэфлексіўнай дзейнасці (кагнітыўны, аперацыянальны, арганізацыйна-дзейсны, інтэгральна-асобасны). Як і любая дзейнасць рэфлексія мае сваю псіхалагічную структуру, якая традыцыйна ўключае патрэбнасці, матывы, мэты, аперацыі, дзеянні, вынікі, прадукты і інш.

Рэфлексіўная кампетэнтнасць як адна са спецыяльных характарыстык прафесійнай самасвядомасці павінна быць паказана як сукупнасць педагагічнай і псіхалагічнай структур, гэта значыць сукупнасць наступных кампанентаў: матывацыйна-мэтавага (адзінства матываў і мэт выкарыстання рэфлексіі для эфектыўнага здзяйснення прафесійнай дзейнасці), кагнітыўна-аперацыйнага (пераасэнсаванне і перабудова асобай самасвядомасці, дзейнасці, стасункаў, якія абапіраюцца на веды, дзе раскрываюцца тэарэтычныя асновы рэфлексіі, і ўменні, якія ляжаць у аснове практычных дзеянняў па здзяйсненні рэфлексіўнай дзейнасці), эмацыянальнага (пачуццё ўпэўненасці ў поспеху станаўлення рэфлексіі, задаволенасці пры авалоданні ўменнямі і разуменне неабходнасці выкарыстання рэфлексіі ва ўласнай практычнай дзейнасці ў мэтах павышэння вынікаў працы) і ацэначнага (самаацэнка выкарыстання ўменняў, якія ляжаць у аснове рэфлексіі, аналіз уласных ведаў, высвятленне памылак і недахопаў, вызначэнне шляхоў іх пераадолення). Кожны з кампанентаў можа знаходзіцца на розных узроўнях сфарміраванасці.

Фарміраванне рэфлексіўнай гатоўнасці спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы – складаны працэс, таму пачынаць яго неабходна з першага курса прафесійнага навучання ва УВА. Як вядома, усялякая педагагічная сістэма можа функцыянаваць паспяхова толькі пры выкананні канкрэтных умоў.

Пры вызначэнні педагагічных умоў, якія садзейнічаюць фарміраванню рэфлексіўнай кампетэнтнасці будучых бібліятэкараў, мы кіраваліся ідэяй максімальнага набліжэння прафесій-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага навучання да ўмоў практычнай дзейнасці, так як у дзейнасці і праз дзейнасць фарміруецца рэфлексіўная гатоўнасць. Вылучэнне педагагічных умоў залежыць ад дакладнасці вызначэння той канчатковай мэты або вынікаў, якія павінны быць дасягнуты, ад разумення, што ўдасканаленне навучання дасягаецца за кошт рэалізацыі не аднаго, а шэрагу ўмоў, іх сістэмы.

Паспяховасць фарміравання кампетэнцый будучых бібліятэкараў залежыць ад комплексу педагагічных умоў. У працах вядомых вучоных-педагогаў (В. І. Андрэева, Ю. К. Бабанскага, І. Я. Лернера, В. Г. Максімава і інш.) з педагагічнага пункту гледжання абгрунтаваны сутнасць, структура і функцыі педагагічных умоў.

Педагагічныя ўмовы фарміравання рефлексіўнай кампетэнцыі ўяўляюць сабой комплекс мер, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе і забяспечваюць паспяховае навучанне. Да іх адносяцца: педагагічная мэта, змест, формы і метады навучання; паэтапная дыягностыка працэсу фарміравання рэфлексіўнай кампетэнцыі, наяўнасць педагагічных сродкаў і т. п.

Неабходна адзначыць, што ў планаванні вучэбных праграм трэба вылучаць канчатковыя мэты, якія павінны быць дасягнуты, і прыватныя, праз якія будучыя бібліятэкары ідуць да канчатковых вынікаў. Таму адзначаныя ў праграмах дысцыплін бібліятэчнага цыкла мэты («Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент і маркетынг», «PR і бібліятэчная рэклама», «Сацыялогія і псіхалогія дзіцячага чытання», «Інавацыйны менеджэнт») – гэта наша стратэгія, а значыць, і ўмова. Мэта забяспечвае адзінства змястоўнага і працэсуальнага бакоў фарміравання рэфлексіўнай кампетэнцыі будучых бібліятэкараў. Для дасягнення мэты вызначаюцца працэсы і змест, формы і метады, сродкі падрыхтоўкі студэнта УВА.

У сувязі з гэтым, пры вызначэнні мэты як педагагічнай умовы мы зыходзілі з гуманістычнай накіраванасці сучаснай адукацыі, якая мяняе старыя ўяўленні аб яе мэце як фарміраванні сістэматызаваных ведаў, уменняў і навыкаў. Ідэя гуманізацыі прадугледжвае прынцыпова іншую падрыхтоўку будучых бібліятэкараў, звязаную не з падрыхтоўкай маладых кваліфікаваных кадраў, а з дасягненнем выніковасці ў агульным і прафесійным развіцці творчай асобы, маралі, гуманнасці. Рэалізацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

многіх задач самаразвіцця, самаактуалізацыі, самаўдасканалення асобы, па нашым меркаванні, дасягаецца сродкамі фарміравання рэфлексіўнай кампетэнцыі, якая забяспечвае кожнаму індывіду свабоду выбару, уласнай мадэлі саманавучання, змянення арганізацыі працэсу пазнання праз індывідуальныя працэсы.

Аналіз зместу педагагічнага працэсу як аптымальнай педагагічнай умовы – гэта працэс фарміравання кампетэнтнасці будучага бібліятэкара-менеджара, прадстаўлены вучэбна-метадычнымі комплексамі, якія маюць галоўную змястоўную нагрузку для фарміравання рэфлексіўнай кампетэнтнасці спецыялістаў і выступаюць як пажаданы вынік падрыхтоўкі спецыяліста.

Пры састаўленні комплексу мы ўлічвалі шляхі эфектыўнага здзяйснення педагагічнай умовы – адзінства зместу, метадаў, форм выкладання, а таксама палажэнне, замацаванае ў гуманістычнай накіраванасці падрыхтоўкі спецыяліста УВА – улік у састаўленні зместу комплексу педагагічных умоў, іх праяўленне ў педагагічным працэсе.

Аналіз педагагічных умоў вызначае змест нашага педагагічнага працэсу, зыходзячы з яго функцый. Гэта актыўныя метады і формы, сродкі падрыхтоўкі ва УВА да прафесійна-творчай дзейнасці. Выбар форм і метадаў павінен вызначацца мэтай, прынцыпамі і зместам педагагічнага працэсу і тымі ўмовамі, у якіх ён адбываецца, дзе неабходна ўлічваць яшчэ і індывідуальна-асобасныя якасці будучага бібліятэкара.

Стварэнне праблемнага адукацыйнага асяроддзя, якое б аднаўляла кантэкст будучай прафесійнай дзейнасці, прадыктавана тым, што патрэбнасць у рэфлексіі ўзнікае не ва ўсіх сітуацыях, а толькі пры вызначаных умовах: у сітуацыі ўзаемадзеяння або пры ўзнікненні праблемнай сітуацыі ў дзеянні. Неабходна аднаўленне таго асяроддзя, у якім трэба працаваць студэнту, выкарыстанне рэальных фрагментаў прафесійнай дзейнасці і міжасабовых адносін людзей, якія ўдзельнічаюць у ёй. Праблемныя заданні, пытанні, рашэнне якіх немагчыма па гатовым ўзоры, выклікаюць патрэбу ў рэфлексіі, ствараюць стымул для выхаду студэнта ў рэфлексіўную пазіцыю, фарміруюць імкненне да ведаў, пазнавальную актыўнасць і самастойнасць, дазваляюць актывізаваць мысліцельныя працэсы, што садзейнічае эфектыўнаму пераўтварэнню ведаў у перакананні, забяспечвае глыбіню і дакладнасць засваення, сфармі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раванасць уменняў. Такім чынам набываецца вопыт рэфлексавання. У змесце адукацыйнага працэсу важным з'яўляецца ўстанаўленне суб'ект-суб'ектных адносін паміж студэнтамі і выкладчыкамі і паміж самімі студэнтамі. Пад суб'ект-суб'ектнымі адносінамі мы разумеем спецыфічную форму міжасабовых адносін суб'ектаў адукацыйнага працэсу, заснаваную на адзінстве дзелавога (супрацоўніцтва) і асобаснага (стасункаў) аспектаў узаемадзеяння, якія даюць магчымасць студэнтам раскрыцца, паказаць сябе і самарэалізавацца ў вучэбнай дзейнасці. Суб'ект-суб'ектная аснова пры навучанні і выхаванні можа быць рэалізавана дзякуючы забеспячэнню ва ўзаемаадносінах педагога і студэнта даверу ў спалучэнні з патрабавальнасцю, даванне студэнту магчымасці кантраляваць сваю дзейнасць. Рэалізацыя дадзенай умовы забяспечваецца ўкараненнем у адукацыйны працэс УВА элементаў модульнага навучання, якое дазваляе адчуць студэнту сваю суб'ектыўнасць у ходзе вырашэння задач планавання, арганізацыі, кантролю, ацэнкі ўзроўню ўласных даследаванняў, забяспечвае індывідуалізацыю ў навучанні, распрацоўцы ўласных адукацыйных маршрутаў. Акрамя гэтага, рэалізацыя дадзеных умоў садзейнічае ўжыванню ў адукацыйным працэсе інтэрактыўных метадаў навучання: арганізацыйна-дзейнасных гульняў, дыскусій, рэфлексіўных партфеляў, абароны праектаў і інш.

Наступная педагагічная ўмова звязана з неабходнасцю наладжвання механізма зваротнай сувязі ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы. Выкананне дадзенай умовы дазваляе стварыць аснову для рэфлексавання, забяспечвае аналіз мэт, працэсу і вынікаў вучэбных дзеянняў выкладчыка і студэнта, асэнсаванне таго, якія элементы недастаткова сфарміраваны, высвятляе неабходнасць па аказанні аператыўнай дапамогі студэнту.

Для эфектыўнага збору аператыўнай і поўнай інфармацыі неабходна выкарыстоўваць комплекс як дыягнастычных методык (для высвятлення ўзроўню сфарміраванасці рэфлексіўнай гатоўнасці), так і такія формы правядзення бягучага кантролю, як рэйтынгавы кантроль, тэсты і г. д.

Сродкі, якія намі выкарыстоўваюцца ў ходзе фарміравання рэфлексіўнай кампетэнцыі будучых бібліятэкараў, аказваюць істотны ўплыў на фарміраванне якасных ведаў і ўменняў, на творчае развіццё студэнтаў, актывізуюць і падтрымліваюць іх

пазнавальныя інтарэсы да вывучэння і вырашэння розных праблем, аптымізуюць самастойную работу і прафесійнае станаўленне. У педагогіцы сродкамі навучання называюць усе аб’екты і працэсы (матэрыяльныя і матэрыялізаваныя), якія з’яўляюцца крыніцай для засваення вучэбнай інфармацыі і інструментамі для засваення зместу вучэбнага матэрыялу, развіцця і выхавання асобы.

Пры выкладанні дысцыплін бібліятэказнаўчага цыкла выкарыстоўваюць наступныя сродкі:

– пазнавальныя (кнігі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, ТСН, ЭВМ);

– маўленчыя сродкі (жывое і друкаванае слова);

– вобразныя сродкі (ілюстрацыі, макеты, мадэлі, відэаадукацыя, натуральныя аб’екты).

Такім чынам, у дачыненні да навучальнага працэсу гэта значыць, што на ўсіх этапах (ад планавання да выніковага кантролю) вучэбны працэс павінен арыентавацца на развіццё і самаразвіццё асобы студэнта на аснове авалодання ёю абагульняючымі спосабамі дзейнасці. Адукацыйны працэс звязаны са станаўленнем рэфлексіі як ключавой кампетэнцыі, якая з’яўляецца найбольш універсальнай па характары і ступені прымяняльнасці кампетэнтнасці.

---

1. *Пискунова, Е. В.* Профессиональная педагогическая рефлексия в деятельности и подготовке педагога / Е. В. Пискунова // Вестн. ТГПУ. – 2005. – Вып. 1 (№ 45). – С. 62–66.

2. *Полищук, О. А.* Развитие рефлексивной компетентности кадров государственной службы : автореф. дис. ... канд. психол. наук : 19.00.13 / О. А. Полищук ; РАНХ и ГС. – М., 1995. – 23 с.

3. *Стеценко, И. А.* Компетентностная модель выпускника как основа формирования рефлексивной компетентности студентов в процессе профессиональной подготовки в педагогическом вузе / И. А. Стеценко, Г. А. Полякова // Концепт : науч.-метод. электронный журнал официального сайта эвристических олимпиад «Co-ART» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.covenok.ru/koncept/2012/1238.htm. – Дата доступа : 11.01.2016.

4. *Хуторской, А. В.* Дидактическая эвристика. Теория и технология креативного обучения / А. В. Хуторской. – М. : МГУ, 2003. – 416 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ